УДК 94(476)

# АДЛІК ЧАСУ. ГІСТОРЫЯ КАЛЕНДАРА

*Студэнт – Каламіец І.Я., 31 тс, 3 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Платоненка А.В., выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

«Слова «каляндар» паходзіць ад старажытнарымскага «календы» («calendae»), што азначала: першыя дні кожнага месяца (дні маладзіка).

Месяцавыя меры часу – найстаражытнейшыя. Развіццё земляробства, жывёлагадоўлі прывяло першабытнага чалавека да карыстання храналагічнымі мерамі. Так з'явіліся ў старажытным свеце сонечны і сонечна-месяцавыя календары. Чалавецтва на працягу свайго існавання ўдасканальвала меры часу, каб каляндар лепш адпавядаў астранамічнаму году. Так з'явіліся спачатку Юліянскі, а потым Грыгарыянскі календары.

Сучасны грамадзянскі каляндар не зусім адпавялае патрабаванням канкрэтнага чалавека або ўсяго соцыуму. Ён не мае логікі ў сваёй пабудове. У ім зафіксафаны падзеі розных гістарычных эпох, сацыяльных плыняў, розных культурных традыцый. Але ў той жа час захавалася даволі моцная сувязь са святамі народнага, традыцыйнага календара.

Для культуры Беларусі характэрны наступныя тыпы календароў: традыцыйны і хрысціянскі календары. Яны суіснуюць і дагэтуль, ствараючы шматслоевую структуру часу. Язычніцкі каляндар, які пазней трансфармуецца ў земляробчы каляндар, – самы старажытны. Нашыя далёкія продкі відавочна сінхранізавалі сваю жыццядзейнасць з найбольш важнымі прыроднымі падзеямі і цыкламі, а таму ў беларускім народным календары такія святы, як Каляды, Гуканне вясны, Купалле і іншыя святы, займалі важнае і істотнае месца. Гэтыя святы былі своеасаблівымі адмецінамі часу, якія пазначалі і паказвалі на тое, што ў прыродным існаванні чалавека адбываліся важныя змены. Перыядычнасць гэтых зменаў

утварала цэлае кола гадавых святаў, а прамежак часу паміж святамі кожны раз запаўняўся новай працай і заняткамі.

Традыцыйны каляндар звязваў чалавека не толькі з прыродай, але і з вераваннямі, уяўленнямі, побытавай сістэмай людзей – з культурай. На ім фактычна была збудаваная першасная сістэма культуры беларускага этнасу. З цягам часу традыцыйны каляндар быў выцеснены царкоўнымі хрысціянскімі календарамі. Традыцыйны каляндар падпарадкоўвае сабе замкнутую культуру ў межах цыклічнага часу. Гэты час не мае выразных межаў будучыні і мінуўшчыны. Усё паўтараецца з дакладнасцю ўсходаў і заходаў сонца, з дакладнасцю зменаў пораў года.

Хрысціянскі каляндар размыкае цыклічны час і ператварае яго ў лінейны. Такім чынам, хрысціянскі каляндар не змог поўнасцю выцясніць каляндар традыцыйны. Наадварот, язычніцкі каляндар стаў той асновай, падмуркам, які стаў асновай каляндара хрысціянскага.

Язычніцкі каляндар адпавядаў асноўным фазам сонца. Каляды – двухтыднёвае святкакванне заканчэння перыяду зімовага сонцастаяння. Купалле – дзень летняга сонцавароту. Гэта дзве важныя фазы руху Сонца на небасхіле. Таксама ёсць дзве пераходныя фазы: веснавое і восеньскае раўнадзенства. Ярыла (супадала з Вялікаднем) – галоўнае свята ў гонар бога Сонца. Багач – свята ў гонар заканчэння збору ўраджаю. Аднак структура беларускага календара сведчыць аб тым, што ў ім ёсць яшчэ чатыры святы, якія адзначаліся ў розных прамежках часу паміж чатырма фазамі Сонца. Яны фіксавалі пераход адной пары года ў іншую. Заканчэнне зімы і надыход вясны былі пазначаны Масленіцай (у іншых рэгіёнах Беларусі гэта магло быць Стрэчанне, Саракі, Звеставанне або Благавешчанне), напрыканцы вясны і напачатку лета святкавалася Сёмуха (зялёныя святкі, ваджэнне куста, ваджэнне стралы). Жніво (з зажынкамі і дажынкамі) фіксавала сітуацыю перахода лета ў восень. Нарэшце, на стыку восені і зімы адзначаліся Восеньскія Дзяды. Неабходна адзначыць яшчэ адну асаблівасць каляндара: калі святы першага цыкла мелі дакладна вызначаныя даты, то святы пераходныя былі рухомымі, гэтаксама як і мяжа паміж порамі года.

З цягам часу народны каляндар ў значнай ступені асіміляваў хрысціянскі і прыцягнуў да важнейшых сваіх урачыстасцей

галоўныя святы хрысціянскай накіраванасці. Адначасова з Калядамі пачалі адзначаць Раство Хрыстова, з Вялікаднем – Пасху, з Сёмухай – Тройцу, следам за Купаллем пачаў святкавацца Ян, або Іван Купала; збору жыта пачаў адпавядаць Спас.

Большасць святаў у сваёй паслядоўнасці з'арыентавана на дыялог чалавека з прыродай, асноўны сэнс якога – заручыцца падтрымкай сіл прыроды, каб яны паспрыялі сельскагаспадарчым работам селяніна. Але нельга не заўважыць, што ў цыкл земляробчых свят уключаны веснавая Радаўніца і Восеньскія Дзяды – найбольш пашыраныя святы, звязаныя з ушанаваннем продкаў. Калі мы злучым веснавыя і восеньскія дні ўшанавання, то стане бачна, што гэтыя святы як бы акрэсліваюць паўсферу, якая ахоплівала час правядзення асноўных земляробчых работ. Дні ўшанавання продкаў адзначалі мяжу пачатку і заканчэння цыкла земляробчых каляндарных святкаванняў. Калі ж лічыць, што раней у беларусаў пачатак Новага года супадаў з днём веснавога раўнадзенства, то атрымліваецца, што першым святам новага жыццёвага цыклу станавілася Радаўніца. Такім чынам, культ продкаў з'яўляецца своеасаблівым структураўтваральным прынцыпам народнага календара беларусаў.

1 Беларускі народны каляндар / Аўт. – уклад А. Лозка. – Мн.: Полымя, 1993.
2 Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: Бел.Сэ, 1989.

УДК 908(680)

## ЗНАКОМЬТЕСЬ: ЮЖНАЯ АФРИКАНСКАЯ РЕСПУБЛИКА

*Студенты – Тхабана Р.Е., 14 эо, 1 курс, ФПУ;*
*Евтух И.Д., 21 мо, 2 курс, ФТС*
*Научный руководитель – Дятко И.М., ст. преподаватель*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г.Минск, Республика Беларусь*

Южная Африканская Республика находится на юге Африки. Площадь ЮАР составляет 1 221 0 40 квадратных километров, территория страны делится на 9 провинций. Внутри ЮАР